Известия Гомельского государственного университета
имени Ф Скорины, № 4 (127), 2021

*УДК 930 (477):94(476)”1921–1939”*

# Даследаванні праблем гісторыі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы ў сучаснай украінскай гістарыяграфіі

А.М. Загідулін

У артыкуле даследуюцца праблемы гісторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) у аб’ектыве ўкраінскай гістарыяграфіі. Упершыню ў беларускай гістарычнай навуцы праведзены аналіз беларусазнаўчай тэматыкі міжваеннага перыяду, якая цікавіла ўкраінскіх гісторыкаў, вызначаны іх метадалагічныя падыходы. Высветлена, што сучасная ўкраінская гістарыяграфія даследуе супольныя з беларусамі праблемы гісторыі: польскую этнаканфесійную палітыку, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, нацыянальна-вызваленчы, асветніцкі і рэвалюцыйны рух. Выяўлены некаторыя спрэчныя пытанні беларускай і ўкраінскай гістарыяграфіі.
**Ключавыя словы:** Заходняя Беларусь, Заходняя Украіна, украінская гістарыяграфія, этнаканфесійная палітыка польскіх улад.

The article examines the problems of the history of Western Belarus (1921–1939) in the lens of Ukrainian historiography. For the first time in Belarusian science, an analysis of Belarusian studies topics of the interwar period of interest to Ukrainian historians was made, and their methodological approaches were identified. Contemporary Ukrainian historiography explores the problems of history common to Belarusians: Polish ethno-confessional policy, the formation of national self-consciousness, the national liberation, enlightenment and revolutionary movements. Some controversial issues of Belarusian and Ukrainian historiography have been revealed.
**Keywords:** Western Belarus, Western Ukraine, Ukrainian historiography, ethno-confessional policy of the Polish authorities.

**Уводзіны.** Беларусы і ўкраінцы працяглы перыяд знаходзіліся ў тых самых дзяржавах і зведалі шэраг агульных гістарычных працэсаў і з’яў. Гісторыкі Беларусі і Украіны вывучаюць пытанні развіцця сваіх народаў, а таксама праблемы гісторыі Польшчы і Расіі. І ва ўкраінскай, і ў беларускай гістарыяграфіі, на жаль, нямнога работ, дзе б узаемна даследаваліся пэўныя з’явы і працэсы ўкраінскай і беларускай гісторыі.

Розныя аспекты жыцця беларусаў у міжваеннай Польшчы да сённяшняга дня застаюцца прадметам навуковых дыскусій беларускіх і польскіх гісторыкаў. У 20–30-я гг. ХХ ст. Заходняя Украіна апынулася ў падобных гістарычных абставінах, што і Заходняя Беларусь, і шматгранны комплекс праблем існавання беларусаў у складзе міжваеннай Польшчы быў вельмі блізкі ўкраінцам. Таму вывучэнне вынікаў даследаванняў украінскімі вучонымі грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і этнаканфесійнага развіцця як Заходняй Украіны, так і Заходняй Беларусі бачыцца, несумненна, актуальным. Аб’ектам дадзенага артыкула выступае ўкраінская гістарыяграфія, а прадметам – вывучэнне гісторыі Заходняй Беларусі ўкраінскімі гісторыкамі.

Спецыяльныя даследаванні напісанага ўкраінскімі гісторыкамі па тэме развіцця Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы адсутнічаюць. Пэўныя спробы прааналізаваць апублікаванае ва Украіне па гісторыі Беларусі робіць адзін з найбольш аўтарытэтных украінскіх даследчыкаў беларускай гістарыяграфіі прафесар Чаркаскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Багдана Хмяльніцкага В. Масненка. У сваім артыкуле прафесар робіць шырокі агляд украінскага беларусазнаўства ХХ – пачатку ХХІ ст. Ён тлумачыць абуджэнне цікавасці ўкраінскіх гісторыкаў да суседняй краіны і яе народа ў канцы ХХ ст. інтэнсіўным працэсам нацыянальнага самавызначэння народаў-суседзяў. Беларусы, па словах В. Масненка, расцэньваліся ўкраінскімі грамадска-палітычнымі дзеячамі і гісторыкамі як саюзнік у супрацьстаянні з расійскім самадзяржаўем у канцы ХІХ – пачатку ХХ ст. [1, с. 321]. Дацэнт Харкаўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя В.Н. Каразіна Д.В. Міколенка, аналізуючы накірункі гістарычных даследаванняў новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Амерыкі, заяўляе аб з’яўленні на гістарычным факультэце гэтай ВНУ новага напрамку даследаванняў – гісторыі Беларусі [2]. Адна з падрыхтаваных тут дысертацый па гісторыі Беларусі – аўтарства Г. Дзядурына [3] – прысвечана дзейнасці беларускіх нацыянальных арганізацый у Польшчы ў 20–30-я гг. ХХ ст.

Украінская гістарыяграфія праблем развіцця Заходняй Украіны ў складзе Польшчы вельмі багатая. Па шэрагу тэмаў яна перасякаецца з заходнебеларускай праблематыкай. Работы ўкраінскіх аўтараў таксама цікавы сваімі метадалагічнымі падыходамі да вывучэння міжваеннай гісторыі Польшчы. Украінская гістарыяграфія гісторыі Заходняй Украіны ў складзе Польшчы ў 20–30-я гг. ў складзе Польшчы даследавана досыць добра. Так, В. Футала ў манаграфіі «Гісторыя вывучэння грамадска-палітычнага жыцця ўкраінцаў у міжваеннай Польшчы (1921–1939)», выдадзенай на аснове матэрыялаў яго доктарскай дысертацыі, падзяляе ўкраінскую гістарыяграфію грамадска-палітычнага жыцця ўкраінцаў у міжваеннай Польшчы на тры досыць відавочныя перыяды: 1920–1930-я гг., 1940–1980-я гг. і 90-я гг. ХХ – пачатак ХХІ стст. [4, с. 45]. Прыхільнік так званай праблемнай гістарыяграфіі В. Футала вылучае ў даследаванях гарамадска-палітычнага жыцця тры тэматычныя накірункі: 1) легальны палітычны лагер у працах украінскіх і замежных гісторыкаў; 2) радыкальныя палітычныя асяродкі (левaрадыкальныя і нацыяналісты); 3) масавыя арганізацыі самакіравання (культурна-асветніцкія арганізацыі, маладзёжныя таварыствы і жаночы рух, кааператывы).

Украінская гістарычная навука ў вывучэнні гісторыі Заходняй Украіны ў складзе міжваеннай Польшчы выйшла на ўзровень выдання бібліяграфічных даведнікаў. У 2019 г. намаганнямі Усходнееўрапейскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Лесі Украінкі апублікаваны электронны навукова-бібліяграфічны паказальнік «Другая Рэч Паспалітая: асаблівасці палітычнага, эканамічнага, сацыякультурнага развіцця» [5].

Станам гістарыяграфічных даследаванняў абумоўлена мэта дадзенага артыкула – вызначыць асноўныя напрамкі, тэмы і ацэнкі ўкраінскай гістарыяграфіі гісторыі міжваеннай Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы.

**Асноўная частка.** Адной з першых тэмаў, агульных для ўкраінцаў і беларусаў, былі культурныя, сувязі паміж нашымі народамі, найперш літаратурныя. Адным з першых зацікавіўся пытаннямі беларусазнаўства славіст і мастацтвазнаўца І. Свянціцкі, працы якога сталі сістэматызаванымі курсамі па гісторыі беларускай літаратуры [6]–[7]. Пэўныя ўзаемадзеянні беларусаў і ўкраінцаў, у першую чаргу ў змаганні з крыжакамі і мангола-татарамі, разглядае гісторык І. Крып’якевіч.

Яшчэ з савецкіх часоў было кан’юнктурна выгадна вывучаць сувязі народаў, што разам будуюць сацыялізм. Найбольш выйгрышна было асвятляць культурныя і мастацкія сувязі [8], [9] і інш. Па-першае, такія сувязі мелі заўсёды пазітыўны характар, па-другое, гэтыя сувязі былі самымі актыўнымі і імкліва развіваліся. Такое ўзаемадзеянне працягваецца і ў постсавецкі час. У першую чаргу, вывучаюцца літаратурныя сувязі [10]. Так, Г. Грыцэнка разглядае ўплыў украінска-беларускіх культурных сувязей на фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі, на развіццё беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Уплыў, сапраўды, быў істотны: Ф. Багушэвіч, А. Пашкевіч (Цётка), Я. Журба, С. Палуян, М. Доўнар-Запольскі жылі, вучыліся ці працавалі ва Украіне. М. Багдановіч перакладаў вершы ўкраінскіх паэтаў, друкаваўся на ўкраінскай мове [11].

У савецкі час як у БССР, так і ва УССР ідэалагічна запатрабаванымі былі тэмы вераломнай польскай нацыянальнай палітыкі, а таксама антыпольскага нацыянальнага і рэвалюцыйнага руху. Трактоўкі савецкіх украінскай і беларускай гістарыяграфій тут былі падобныя. У манаграфіі Ю. Сліўкі «Заходняя Украïна ў рэакцыйнай палітыцы польскай і ўкраінскай буржуазіі (1920–1939)» класавы падыход пераважае над нацыянальным: аўтарам украінская буржуазія аб’ядноўваецца з польскай і характарызуецца негатыўна [12]. У 1958 г. з’яўляецца цікавае, каштоўнае сваім фактaлагічным напаўненнем даследаванне Я.Р. Дашкевіча «Беларускія камуністычныя выданні ў Львове» [13]. Папулярнымі былі манаграфіі, прысвечаныя сялянскаму і рабочаму руху [14], а таксама артыкулы аб інтэрнацыянальнай салідарнасці працоўных Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ў барацьбе за ўз’яднанне з СССР [15].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У постсавецкай гістарыяграфіі знікае савецкі ідэалагічны дыктат у гістарычных даследаваннях. Кола гістарычных працэсаў у аб'ектыве вучоных пашыраецца, змяняюцца акцэнты і ацэнкі разглядаемых пытанняў. Грамадска-палітычны рух беларусаў і ўкраінцаў у складзе Польшчы ўжо асвятляецца не так адназначна.

Марыупальскі даследчык Я.С. Горб, комплексна вывучаючы дзейнасць палітычных партый у міжваеннай Польшчы, закранае і беларускую тэматыку. Адзін з яго артыкулаў прысвечаны непасрэдна палітычным партыям і арганізацыям беларусаў у Другой Рэчы Паспалітай, у якім коратка характарызуюцца палітычная і сацыяльная платформа дадзеных арганізацый, а таксама ўнутраныя і знешнія фактары, што паўплывалі на развіццё беларускай грамадска-палітычнай думкі ў Польшчы ў 20–30-я гг. Вучоны прыходзіць да высновы, што нізкі сацыяльна-эканамічны ўзровень развіцця Заходняй Беларусі паспрыяў папулярнасці сярод беларусаў партый пераважна левага кірунку. Таксама ў артыкуле прасочана паслядоўнае імкненне большасці беларускага насельніцтва Польшчы да «незалежнасці» або «аўтаноміі Беларусі» [16].

Важнай для разумення беларуска-польскіх адносін з'уляецца работа Б. Гудзя «Українсько-польські конфлікти новітніоі доби: етносоціальний аспект» [17]. Б. Гудзь разглядае ўкраінска-польскія канфлікты навейшага часу. Аналізуючы ўкраінскую гістарыяграфію гэтай праблемы, аўтар вылучае некалькі тэндэнцый. Большасць гісторыкаў, што стаяць, як адзначае навуковец, на «дзяржаўніцкіх» пазіцыях, не да канца зацікаўлены ў вывучэнні характару і працякання польска-ўкраінскіх канфліктаў XX ст., над імі вісіць пагроза «абвінавачванняў ў недахопе патрыятызму». Гісторыкі-марксісты, наадварот, украінцаў у тых канфліктах характарызуюць з негатыўным адценнем як нацыяналістаў. Трэцюю групу складаюць гісторыкі культурна-антрапалагічнага накірунку. Сам жа Б. Гудзь падкрэслівае, што ўкраінска-польскія канфлікты мелі не палітычны, а этнасацыяльны характар і фарміраваліся на працягу стагоддзяў [17, с. 15].

У XXI ст. цэнтрам сучаснага ўкраінскага беларусазнаўства становіцца Чаркаскі нацыянальны ўніверсітэт імя Б. Хмяльніцкага. Гісторыкі дадзенага ўніверсітэта выконвалі грант Дзяржаўнага фонду фундаментальных даследаванняў Украіны № Ф67/27-2016 «Спільна історія Украіны та Білорусі в сучасній колективній пам'яті обоіх народів: компаративний аналіз» пад кіраўніцтвам прафесара В.В. Масненка. Па выніках работы выдадзена калектыўная манаграфія [18]. Адна з аўтараў Л. Сіняўская, аналізуючы вобраз Беларусі ў вачах украінцаў, адзначае, што беларусазнаўства сучаснай украінскай гістарыяграфіі знаходзіцца на пачатковай стадыі, хоць і мае несумненныя поспехі ў апошні час [19, с. 242]. В. Масненка бачыць значныя перспектывы будучых узаемных даследаванняў беларусаў і ўкраінцаў. Зыходным пунктам даследавання можа быць канстатацыя факта, што народы, якія маюць багаты досвед сумеснага гістарычнага існавання, сёння апынуліся ў розных умовах функцыянавання гістарычнай навукі і стварэння калектыўнай памяці. Гістарычная памяць, на думку В. Масненка, па-ранейшаму патрабуе дэканструкцыі традыцыйнай схемы расійскай велікадзяржаўнай гістарыяграфіі, якая не ўлічвае фарміравання нацыянальнай свядомасці ўкраінцаў і беларусаў, а таксама развіцця нацыянальных канцэпцый гісторыі [20, с. 192].

Вышэйзгаданы даследчык з Харкава Г. Дзядурын, які ў 2006 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Дзейнасць беларускіх нацыянальных арганізацый ў Польшчы (1921–1939 гг.)» [3], асноўнай асаблівасцю беларускага нацыянальнага руху ў Польшчы лічыць няспеласць і сялянскі характар беларускага грамадства, нешматлікасць інтэлігенцыі. У беларускім руху ў Польшчы гісторык вылучае тры асноўныя накірункі: паланафільскі, нацыянальна-дэмакратычны і камуністычны [21].

Тэрыторыя Заходняй Беларусі ўводзіцца ў межы даследаванняў украінскіх гісторыкаў падчас вывучэння з'яў і працэсаў, што адбываліся на ўкраінскай тэрыторыі, але распаўсюджваліся і на беларускую. Напрыклад, дзейнасць Украінскай паўстанцкай арміі. У 2014 г. у серыі «Летапіс УПА» выдадзены ілюстраваны біяграфічны даведнік [22] «Украінскі вызвольны рух у постацях кіраўнікоў. Валынская і Брэская вобласці (1930–1955)». Для беларускай гістарыяграфіі такія тэмы не з'яўляюцца традыцыйнымі, тым больш з пазітыўнымі ацэнкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ва ўкраінскай гістарыяграфіі постсавецкага часу вельмі папулярныя даследаванні, прысвечаныя ўкраінскай эліце і ўкраінскай інтэлігенцыі, у тым ліку і ў міжваенны час [23]–[27].

У даследаваннях лёсу беларусаў у міжваеннай Польшчы асобную групу ва ўкраінскай гістарыяграфіі складаюць агляданыя шматтомныя «Гісторыі Украіны» і падручнікі па гісторыі Польшчы, дзе праблемы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі разглядаюцца паралельна і на фоне палітычных і эканамічных працэсаў Украіны і Польшчы. У агляднай «Гісторыі Польшчы» аўтары М. Крыкун і А. Зашкільняк разглядаюць становішча ўкраінцаў і беларусаў у Другой Рэчы Паспалітай. Характарызуючы беларускую нацыянальную меншасць, аўтары называюць самай шматлікай беларускай парыяй КПЗБ, якая была часткай камуністычнай партыі Польшчы. Сярод іншых партый згадваецца толькі Беларуская хрысціянская дэмакратыя, якая характарызуецца як нешматлікая і памяркоўная [28, с. 462]. Вельмі арыгінальна трактуецца камуністычны партызанскі рух – як дзейнасць украінскіх і беларускіх радыкальных арганізацый, якія чынілі замахі на польскіх чыноўнікаў, пратэстуючы супраць палітыкі польскага ўраду ў галіне асветы, польскага асадніцтва. Прафесар Зашкільняк аперуе нязвыклымі для беларускай гістарыяграфіі паняццямі «беларускія камуністычныя баевікі» і «беларускія партызанскія атрады» [28, с. 467]. Сучасныя ж беларускія гісторыкі стараюцца развесці камуністычны рух і беларускі нацыянальна-вызваленчы, звязваючы дзейнасць КПЗБ выключна з інспірацыяй Савецкага Саюза.

Аглядных «Гісторый Украіны» існуе вельмі шмат. Найбольш папулярнай і дасканалай у метадалагічным плане лічыцца «Нарыс гісторыі Украіны: фарміраванне сучаснай украінскай нацыі XIX–XX ст.» Яраслава Грыцака [29]. Аўтар адзначае, што ў XX ст. найцяжэйшая палітычная і культурная спадчына дасталася ўкраінцам – жыхарам былой Расійскай імперыі. Яны валодалі найслабейшай нацыянальнай самасвядомасцю (прыводзіцца прыклад пра 700 тыс. «тутэйшых» па перапісу 1931 г. у Палескім ваяводстве). Таму рухавіком нацыянальнага жыцця як у культуры, так і палітыцы былі ўкраінцы з іншых тэрыторый, у першую чаргу, выхадцы з былой Аўстра-Венгрыі [29, с. 345]. Пра беларусаў Я. Грыцак у гэтым кантэксце не згадвае, але напрошваецца аналогія, таму што ўсе беларусы міжваеннай Польшчы – выхадцы з былой Расійскай імперыі. Беларусы Я. Грыцаком разглядаюцца праз прызму нацыянальнай палітыкі польскіх правячых колаў. Адзначаецца, што некаторыя польскія левыя і сялянскія партыі прадугледжвалі ў сваіх праграмах пэўныя паслабленні для ўкраінскай і беларускай нацыянальных меншасцей. Таксама Я. Грыцак робіць выснову, што стаўленне Пілсудскага да нацыянальных меншасцей вызначалася не федэратыўнымі планамі, а інтарэсамі нацыянальнай бяспекі [29, с. 349].

Увогуле, ва ўкраінскай гістарыяграфіі паняцце «Заходняя Украіна», у адрозненне ад паняцця «Заходняя Беларусь» у беларускай гістарыяграфіі, мае досыць шырокі і геаграфічна неадназначны сэнс. У сучаснай украінскай навуцы часцей выкарыстоўваюцца такія сталыя назвы гісторыка-геаграфічных рэгіёнаў як «Усходняя Галіцыя», «Заходняя Валынь», «Холмшчына», «Падляшша» і «Палессе». Такім чынам, пад Заходняй Украінай украінскія вучоныя разумеюць у тым ліку і тэрыторыі, якія мы лічым Заходняй Беларуссю. Знакаміты ўкраінскі гісторык, спецыяліст па праблемах міжваеннага перыяду С. Кульчыцкі ў адным з тамоў 15-томнай агляднай гісторыі Украіны «Україна крізь віки» Валынскае, Палескае і Навагрудскае ваяводствы называе паўночна-заходнімі землямі (у адносінах да ўсёй украінскай тэрыторыі). Палессе С. Кульчыцкі без ваганняў лічыць украінскай тэрыторыяй, прычым без аргументаў [30, с. 296].

Такім чынам, праз геаграфічныя розначытанні ўкраінскія гісторыкі вывучаюць падзеі, што адбываліся на тэрыторыях, якія беларуская гістарыяграфія ўключае ў межы сваіх даследаванняў Заходняй Беларусі.

У полі зроку сучаснай украінскай гістарыяграфіі знаходзіцца таксама і нацыянальная палітыка Польшчы ў адносінах да нацыянальных меншасцей. Прычым, калі беларуская гістарыяграфія працягвае лічыць дадзеную палітыку бясспрэчна брутальнай і варожай для беларусаў, то ўкраінскія гісторыкі ў польскай грамадска-палітычнай думцы выдзяляюць у тым ліку і плынь так званых «украінафілаў» – палітыкаў і грамадскіх дзеячаў, што мелі ліберальныя погляды ў адносінах да нацыянальных меншасцей, такіх як Леан Васілеўскі, Тадэвуш Галуўка,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пётр Дунін-Баркоўскі і іншыя, і нават публікуюць пераклады іх работ [31]. Ю. Крамар, напрыклад, аналізуючы погляды Т. Галуўкі, называе яго «адным з найвыдатнейшых прадстаўнікоў праметэісцкага руху ў Польшчы, блізкім паплечнікам Ю.Пілсудскага» [32, с. 316]. Як мы ведаем, у лагеры пілсудчыкаў у другой палове 20-х гг. экспертам па ўкраінскаму пытанню лічыўся Т. Галуўка, а па беларусам і літоўцам – Л. Васілеўскі. Аўтар адзначае, што Т. Галуўка называў гвалтоўную паланізацыю «шкоднай і абсурднай», прапаноўваў шэраг мер нармалізацыі польскай як эканамічнай, так і сацыяльнай палітыкі. Яго падтрымлівалі і іншыя «ўкраінафілы» лагера Ю. Пілсудскага. Але Ю. Крамар прыходзіць да высновы, што погляды Галуўкі былі занадта радыкальнымі для вырашэння ўкраінскага пытання, таму яны не знайшлі падтрымкі ў Пілсудскага і ва ўрадавых колах і засталіся на паперы [32, с. 318].

Выпрацоўку польскай нацыянальнай палітыкі, яе рэалізацыю і рэакцыю палітычных колаў нацыянальных меншасцей даследуе А. Руда. Аўтар засяроджвае ўвагу на палітыцы ў галіне асветы і на моўнай палітыцы. Цікавым з'яўляецца падыход да праблемы праз прызму рэгіянальнай гісторыі, калі агульныя працэсы разглядаюцца на прыкладзе Галічыны [33].

**Заключэнне.** Украінскае беларусазнаўства пачынаецца з даследавання ўкраінска-беларускіх гісторыка-культурных сувязяў яшчэ ў часы Расійскай імперыі і актыўна развіваецца ў савецкі час. Савецкія ўкраінскія гісторыкі аналізавалі нацыянальна-вызваленчую і рэвалюцыйную барацьбу працоўных Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Польская нацыянальная і канфесійная палітыка ў Заходняй Украіне ацэньвалася адназначна як асімілятарская.

Яшчэ з савецкіх часоў вывучаюцца падзеі і з'явы ўласна ўкраінскай гісторыі, якія адбываліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі: дзейнасць украінскіх нацыянальных арганізацый ад УПА да «Просвіты», царкоўныя ўніяцкія асяродкі і інш. У постсавецкі перыяд з'яўляюцца работы, у якіх ліберальныя плыні польскай этнаканфесійнай палітыкі разглядаюцца як спроба ўлад Польшчы знайсці кансэнсус са славянскімі нацыянальнымі меншасцямі. У 1990–2000-я гг. ва ўкраінскай гістарыяграфіі назіраецца рост цікавасці да праблем генэзісу, структуры і асаблівасцей беларускага грамадска-палітычнага руху ў міжваеннай Польшчы, з'яўляюцца абароненыя дысертацыі.

Сярод нявырашаных праблем гісторыі 20–30-х гг. паміж украінскімі і беларускімі навукоўцамі трэба назваць неадназначнасць трактоўкі вызначэння тэрыторый Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, якія знаходзіліся ў складзе Польшчы. Украінская гістарыяграфія вырашае для сябе дадзеную праблему, выкарыстоўваючы падыходы рэгіянальнай гісторыі. Геаграфічнымі межамі ўкраінскіх даследаванняў усё часцей становяцца не ўтвораная ў выніку ваенных канфліктаў Заходняя Украіна, а традыцыйныя гісторыка-геаграфічныя рэгіёны: Усходняя Галічына, Валынь, Палессе, Холмшчына і Падляшша [34, с. 73].

У пачатку 2000-х гг. ва Украіне пачынаюць фарміравацца навуковыя асяродкі вывучэння праблем гісторыі Беларусі. Супольна з беларускімі калегамі ўкраінскія гісторыкі займаюцца, у першую чаргу, асэнсаваннем этапаў фарміравання беларускай гістарычнай думкі, праблемамі развіцця гістарычнай метадалогіі ў постсавецкіх грамадствах. Такім чынам, украінская сучасная гістарыяграфія паступова пачынае выходзіць на ўзровень зацікаўленасці праблемамі не толькі айчыннай гісторыі, але і гісторыі сваіх суседзяў.

## Літаратура

1. Масненка, В. Беларусь і беларусазнаўства ў славістыцы Украіны XX – пачатку XXI ст. / В. Масненка // Народы и культуры славянского мира Восточной Европы в исторической ретроспективе (Беларусь, Украина, Россия, Польша) : сб. науч. ст. / ред-сост. А. Д. Дудько. – Гродно : ЮрСа-Принт, 2020. – С. 321–325.

2. Миколенко, Д. В. Дослідження історії зарубіжних країн Європи й Америки нового та новітнього часу на історичному факультеті / Д. В. Миколенко // Вісник Харківського національного університету ім. В. Н. Каразіна. Сер. Історія. – 2015. – № 1145, вип. 50. – С. 59–71.

3. Дедурін, Г. Г. Діяльність білоруських національних організацій у Польщі (1921–1939 рр.) : автореф. дис. ... канд. іст. наук : 07.00.02 / Г. Г. Дедурін ; Харківський нац. ун-т ім. В. Н. Каразіна. – Харків, 2006. – 24 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ